УДК 94(476)

*Н.М. Аляксейчыкава*

# МАТРЫМАНІЯЛЬНАСЦЬ БЕЛАРУСКІХ ГАРАДЖАН У XVI–XVIII СТАГОДДЗЯХ (ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫ АСПЕКТ)

Дадзены артыкул прысвечаны гістарыяграфіі матрыманіяльных паводзін гараджан у XVI–XVIII стагоддзях. Гісторыя сям'і беларусаў з'яўляецца малавывучанай тэмай у айчыннай гістарыяграфіі. Упершыню дадзеная тэма зацікавіла навукоўцаў-этнографаў. Менавіта яны зрабілі першы крок у вывучэнні матрыманіяльных паводзін нашых продкаў. Ім належыць шэраг прац, прысвечаных гісторыі сялянская сям'і. Некаторыя звесткі па дадзенай праблематыцы можна знайсці ў даследаваннях педагогаў і прававедаў. У сваіх працах яны ўздымаюць асобныя пытанні, якія датычацца матрыманіяльнасці насельніцтва беларускіх зямель: выхаванне дзяцей, прававы статус членаў сям'і і г.д. У апошнія гады дадзеная праблематыка зацікавіла і айчынных гісторыкаў. На сённяшні дзень маюцца працы, прысвечаныя сямейнаму жыццю сялянства і шляхты. Сямейнае ж жыццё гараджан доўгі час заставалася па-за ўвагай айчынных даследчыкаў. Сёння беларускія гісторыкі робяць першыя, але вельмі важныя крокі ў напрамку вывучэння гісторыі сям'і беларускага мяшчанства.

## Уступ

На сённяшні дзень айчыннымі даследчыкамі разгледжана разнастайнае кола праблем па гісторыі нашай Радзімы. Аднак па-ранейшаму існуюць тэмы, якія па радзе прычын не трапілі ў поле зроку беларускіх гісторыкаў. Да ліку такіх праблем можна аднесці і матрыманіяльныя паводзіны жыхароў Беларусі, і гараджан у тым ліку. Сёння маюцца працы, прысвечаныя сямейнаму жыццю сялянства і шляхты. Сямейнае жыццё гараджан доўгі час заставалася па-за ўвагай айчынных даследчыкаў, і толькі у апошнія гады матрыманіяльныя паводзіны гараджан у эпоху сярэднявечча зацікавілі беларускіх гісторыкаў. У айчыннай гістарычнай навуцы з'явіліся працы, у якіх разглядаюцца тыя ці іншыя пытанні па дадзенай праблематыцы, але, на жаль, па-ранейшаму няма ніводнага комплекснага даследавання, якое б усебакова адлюстроўвала сямейнае жыццё гараджан у XVI–XVIII стст. У сувязі з гэтым гістарыяграфія матрыманіяльных паводзін жыхароў Беларусі таксама фактычна адсутнічае ў айчыннай гістарычнай навуцы. Дадзены артыкул з'яўляецца першай спробай гістарыяграфічнага даследавання сямейнага жыцця нашых продкаў у XVI–XVIII стст. У ім разглядаюцца працы дарэвалюцыйных, савецкіх і сучасных гісторыкаў.

## Дарэвалюцыйная гістарыяграфія

У гістарыяграфіі матрыманіяльных паводзін беларускіх гараджан XVI–XVIII стст. можна вылучыць некалькі этапаў:

1) дарэвалюцыйны (XIX – пачатак XX ст.);

2) савецкі (XX ст.), уключае як даследаванні айчынных, так і замежных гісторыкаў;

3) сучасны (90-я гады XX ст. – XXI ст.).

Першыя крокі па вывучэнню матрыманіяльных паводзін жыхароў Беларусі ў XVI–XVIII стст. былі зроблены ў XIX ст. Працы гэтага перыяду не ставілі сваёй мэтай вывучэнне дадзенай праблематыкі. Даследчыкі, якія займаліся вывучэннем права Вялікага княства Літоўскага, спыняюцца на юрыдычных аспектах сямейнага жыцця нашых продкаў [2, с. 199; 16].

---

Навуковы кіраўнік – І.А. Марзалюк, доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А.А. Куляшова

Вялікі ўклад у распрацоўку дадзенага праблемнага поля ўнеслі вучоныя-этнографы XIX – пачатку XX ст. Для даследаванняў сярэдзіны XIX стагоддзя характэрна перш за ўсё цікавасць да звычаяў і традыцый, звязаных з рознымі бакамі жыцця сям'і. Сярод даследчыкаў гэтага часу магчыма назваць імёны Я.Ф. Карскага (“Белорусы”), А. Кіркора (“Следы язычества в празднествах, обрядах и песнях”), П. Шпілеўскага (“Белоруссия в характеристических описаниях и фантастических ее сказках”). У апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX стст. з'яўляюцца капітальныя працы, прысвечаныя вывучэнню быту беларускага народа. Тут перш за ўсё трэба нагадаць работы такіх вучоных-этнографаў, як М.В. Доўнар-Запольскі (“Очерки семейного обычного права крестьян Минской губернии”), Е.Р. Раманаў (“Белорусский сборник”), П.В. Шэйн (“Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края”), М. Косіч (“Литвины-белорусы Черниговской губернии, их быт и нравы”), Н.Я. Нікіфароўскі (“Очерки простонародного житья-бытия крестьян в Витебской Белоруссии”), А.Я. Багдановіч (“Пережитки древнего миросозерцания у белорусов”) [4; 5]. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на працу М.М. Нікольскага “Происхождение и история белорусской свадебной обрядности”, якая прысвечана шлюбнай абраднасці беларускіх сялян. Аўтар, разглядаючы шлюбную абраднасць XIX–XX стст., спыняецца і на традыцыях, якія бяруць свой пачатак у XIV–XVI стст. [22, с. 52–53].

У пачатку XX стагоддзя дадзеная праблематыка трапляе ў поле зроку гісторыкаў. З'яўляюцца і першыя працы, якія закранаюць некаторыя пытанні, звязаныя з сямейным жыццём. У рабоце А. Грушэўскага “Пинское Полесье XIV–XVI стст. Исторические очерки” разглядаюцца маёмасныя ўзаемаадносіны паміж родзічамі, якія былі характэрны для шляхецкіх сем'яў. Акрамя гэтага, дадзеная праца мае вялікую цікавасць яшчэ і таму, што ў яе дадатку змешчаны дакументы, якія адносяцца да разглядаемага часу і прысвечаны ўзаемаадносінам у дзвюх шляхецкіх сем'ях – Грыцка Іванавіча Грынчыновіча і Сямёна Іванавіча Дамановіча-Дзікавіцкага [9, с. 72–123, Дадатак с. 70–72, 120–121, 138–143].

У айчыннай гістарыяграфіі маецца шэраг работ, у якіх асвятляюцца розныя аспекты сямейнага жыцця насельніцтва Беларусі. Напрыклад, артыкул А. Ефіменкі “Литовско-русские данники и их дани” прысвечаны падаткам падатнага саслоўя беларуска-літоўскіх земляў, “даннікаў”. Сярод пералічаных падаткаў аўтар прыводзіць і такія, якія маюць непасрэднае дачыненне да матрыманіяльных паводзін жыхароў беларуска-літоўскіх земляў (“удоўя” і “дзявочая куніца” – падаткі, якія плацілі жанчыны, калі збіраліся замуж; “развод” – “*плата замковому уряду за развод”;* “пачараўшчызна” – падатак, які плацілі ў тым выпадку, калі сям'я стваралася без вянчання ў царкве, “на веру” [11, с. 118]. Дадзеныя па абкладанні падаткамі жыхароў беларуска-літоўскіх земляў дазваляюць больш поўна ўявіць некаторыя асаблівасці матрыманіяльных паводзін продкаў беларусаў у XVI стагоддзі.

Такім чынам, дадзены этап характарызуецца адсутнасцю прац, непасрэдна прысвечаных даследаванням гісторыі сям'і і сямейных узаемаадносін у эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Найбольшую ўвагу выклікала гісторыя сялянскай сям'і. Матрыманіяльныя ж паводзіны шляхецкай сям'і і сем'яў гараджан вывучаліся фрагментарна.

**Гістарыяграфія савецкага часу**

Даследаванні савецкага часу, як і ў папярэдні перыяд, не былі непасрэдна накіраваны на вывучэнне матрыманіяльных паводзін жыхароў Беларусі, у тым ліку і гараджан. Перш за ўсё гісторыкаў гэтага перыяду цікавілі пытанні эканамічнага і прававога стану сям'і. Першы крок у напрамку вывучэння старажытнага беларуска-літоўскага права быў зроблены А. Таўталес у рабоце “Права сямейнае паводле літоўскіх статутаў (нарыс да гісторыі старажытнага беларуска-літоўскага грамадзянскага права)”.

У даследаванні прасочана эвалюцыя сямейнага заканадаўства на працягу XVI стагоддзя, што дасягаецца пры дапамозе параўнальнага аналізу тэкстаў Статутаў 1529, 1566 і 1588 гадоў. У рабоце разглядаюцца маёмасныя правы і абавязкі членаў сям'і і іх бліжэйшых родзічаў, закрануты пытанні, звязаныя з заключэннем і скасаваннем шлюбу, нададзена ўвага і праблеме апякунства [29]. У гэтым жа напрамку праводзіў свае даследаванні І.А. Юхо. У яго працы "Правовое положение населения Белоруссии в XVI в." аналізуецца звычаёвае і пісьмовае права беларускіх земляў часоў феадалізму. Аўтар разглядае этапы заключэння шлюбнага саюзу, умовы заключэння і скасавання шлюбу [32].

Неабходна прыгадаць і кнігу З.Ю. Капыскага "Экономическое развитие городов Беларуси в XVI–XVII вв.". У сваёй працы З.Ю. Капыскі разгледзеў і пытанні, звязаныя з сацыяльным статусам членаў сям'і [16, с. 52]. Некаторыя звесткі па гісторыі сялянскай сям'і знаходзім у рабоце П.Г. Казлоўскага "Крестьяне Белоруссии во второй половине XVII–XVIII вв." (1969 г.), а таксама ў калектыўнай працы аўтараў "Общественный, семейный быт и духовная культура населения Полесья" (1987 г.), у якой разглядаецца структура, колькасны склад сям'і, даецца яе тыпалогія [4, с. 15, 19, 41; 15, с. 34].

Значны ўклад у вывучэнне асобных бакоў сямейнага жыцця ўнеслі педагогі і прававеды. Прававеды – А.Г. Харчаў, М.Г. Юркевіч і З.А. Янкова – стварылі першыя спецыяльныя даследаванні, якія характарызуюць сямейнае права XIV–XX ст. [29, с. 13]. Пытанні выхавання дзяцей разглядаюцца ў кнізе "Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г.". Яна прысвечана праблеме адукацыі, ў той жа час аўтары спыняюцца на спосабах выхавання ў цэлым [1].

Шлюбным звычаям і традыцыям прысвечана работа калектыву беларускіх этнографаў "Вяселле: Абрад". У ёй аўтары не толькі спыняюцца на эвалюцыі шлюбных звычаяў і традыцый, якія былі распаўсюджаны на беларускіх землях, але і прыводзяць апісанні тых звычаяў, якія былі характэрны для папярэдняга часу. Напрыклад, у кнізе змешчана апісанне Янам Ласіцкім шлюбных звычаяў, якія існавалі на Беларусі ў XVI стагоддзі [7, с. 37–38].

Такім чынам, савецкі перыяд мала чым адрозніваўся ад папярэдняга. Праблема матрыманіяльных паводзін нашых продкаў па-ранейшаму заставалася па-за ўвагай гісторыкаў.

**Польская гістарыяграфія**

Вялікі ўклад у вывучэнне матрыманіяльных адносін у Вялікім княстве Літоўскім у XVI–XVII стст. унеслі польскія гісторыкі. У працы калектыва польскіх даследчыкаў "История государства и права Польши" змешчана некалькі глаў, дзе разглядаюцца некаторыя аспекты матрыманіяльнасці як польскіх, так і беларускіх гараджан. Аўтары падрабязна характарызавалі прававы аспект шлюбу і сямейнага жыцця жыхароў Рэчы Паспалітай. Польскія гісторыкі таксама спыніліся на пытаннях заключэння і скасавання шлюбу, апекі, а таксама маёмасных адносін паміж мужам і жонкай [3, с. 130–145, 239–246].

У працы Ю. Бардаха «O dawnej b niedawnej Litwe» таксама знайшоў адлюстраванне прававы бок шлюбу. Польскі гісторык, разглядаючы гісторыю стварэння Статутаў 1529, 1566 і 1588 гадоў і распаўсюджанне на землях Вялікага княства Літоўскага магдэбургскага права, акцэнтуе ўвагу на тых пытаннях, якія рэгулююць узаемаадносіны паміж членамі адной сям'і. У працы паказана, як рэгулявала заканадаўства правы нашчадкаў у дачыненні да нерухомай маёмасці [33, p. 124–139].

Асаблівай увагі заслугоўвае работа З. Куховіча "Człowiek polskiego baroku". У сваёй кнізе аўтар ажыццявіў падрабязнае даследаванне важнейшых бакоў паўсядзённага жыцця чалавека ў перыяд барока на тэрыторыі Рэчы Паспалітай. З. Куховіч апісаў і такі важны бок сямейных адносін, як сексуальнае жыццё мужа і жонкі [34].

У кнізе вядомага польскага гісторыка Ю. Бардаха "Штудыі з гісторыі Вялікага княства Літоўскага" пятая глава прысвечана матрыманіяльным адносінам. Аўтар спыняецца на тым, як свецкае і царкоўнае права рэгулявала сямейна-шлюбныя адносіны і як гэтыя адносіны рэгуляваліся звычаёвым правам у эпоху Сярэднявечча і ранняга Новага часу. Разглядае Ю. Бардах таксама тыя асаблівасці, якія былі характэрны для розных слаёў насельніцтва – шляхты, гараджан і сялянства, прычыны яго скасавання, ролю царкоўнага і нявенчанага шлюбу ў XVI–XVII стст. і адносіны да грамадства гэтых форм шлюбу [2].

Польская гістарычная навука зрабіла вельмі значны крок наперад у вывучэнні матрыманіяльных паводзін жыхароў беларускіх зямель у XVI–XVIII стст. у параўнанні з іншымі нацыянальнымі гістарычнымі школамі. Менавіта польскія гісторыкі ставілі сваёй мэтай даследаванне паўсядзённага жыцця насельніцтва ВКЛ, у той час як айчынныя даследчыкі, на жаль, пакінулі па-за ўвагай дадзеную праблематыку.

**Даследаванні на сучасным этапе**

Канец XX – пачатак XXI стст. з'яўляецца якасна новым этапам у вывучэнні матрыманіяльных паводзін гараджан беларускіх зямель у XVI–XVIII стст. Пачынаючы з 90-х гадоў XX стагоддзя беларускія гісторыкі адначасова з распрацоўкай пытанняў, звязаных з гісторыяй сям'і, здзейснілі цэлы шэраг комплексных даследаванняў, прысвечаных гісторыі матрыманіяльных паводзін шляхты і сялянства.

У гэты час працягваюць свае даследаванні правазнаўцы. У рабоце І.А. Юхо «Крыніцы беларуска-літоўскага права» даецца характарыстыка маёмасных узаемаадносін мужа, жонкі і дзяцей, разглядаюцца пытанні спадчыннага права, а таксама звяртаецца ўвага на шлюбныя звычаі жыхароў Беларусі ў цэлым і гараджан у прыватнасці [31]. Праца беларускага прававеда Г. Дзербінай "Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу" з'яўляецца адной з апошніх прац у гэтай галіне. Аўтар выканала комплекснае даследаванне шлюбна-сямейнага права на аснове аналізу заканадаўчых і іншых дакументальных крыніц, а таксама навуковай гістарыяграфіі прадмета [10].

Даследаванні ў галіне педагагічнай традыцыі насельніцтва беларускіх зямель у XVI–XVIII стст. былі працягнуты педагогамі. І.І. Калачова ўздымае пытанні этнапедагагічных традыцый насельніцтва беларускіх зямель, спыняецца на тых нормах узаемаадносін, якія існавалі ў тагачаснай сям'і, а таксама на этнапедагагічнай спадчыне беларусаў [12; 13]. У працах Г.П. Арловай і Л.В. Ракавай даследуецца адзін з важных бакоў матрыманіяльных адносін – выхаванне падрастаючага пакалення [29, с. 13; 23]. В.С. Болбас, разглядаючы педагагічную думку XVI–XVII стст., засяроджвае ўвагу на метадах выхавання, якія былі характэрны для гэтага часу [6].

Гісторыкі таксама звярнулі ўвагу на гісторыю сям'і і матрыманіяльныя паводзіны нашых продкаў. Сярод прац, прысвечаных матрыманіяльным адносінам беларусаў, трэба згадаць кнігу "Скарына і яго эпоха", у якой аўтары здолелі стварыць рознабаковую характарыстыку эпохі Скарыны. Яны спыняюцца на тыпалогіі сялянскай і гарадской сям'і, правах і абавязках яе членаў, выхаванні, перадшлюбных звычаях і традыцыях, якія былі распаўсюджаны на беларускіх землях у XV – першай палове XVI стагоддзя, а таксама засяроджваюць увагу на існаванні нявенчанага шлюбу ў гарадскім асяроддзі, адносінах жыхароў гарадоў да пазашлюбных стасункаў [30, с. 80–90]. Матрыманіяльным паводзінам нашых продкаў прысвечана і кніга "Сям'я і сямейны быт беларусаў", напісаная калектывам аўтараў (В.К. Бандарчык, Г.М. Курыловіч, Л.В. Ракава, Т.І. Кухаронак, І.В. Чаўкін, І.Г. Вуглік). Становішча, якое займаў кожны з членаў сям'і; выхаванне дзяцей; заключэнне шлюбу і звязаныя з ім умовы – вось толькі частка пытанняў, якія ўздымаюць у сваёй працы беларускія гісторыкі [26, с. 16–42].

Айчынныя даследчыкі ў сваіх працах звярнулі ўвагу на сямейнае жыццё прадстаўнікоў шляхты. Становішчу, якое займалі жанчыны-шляхцянкі ў сям’і, прысвечаны артыкул Н. Сліж “Статус жанчыны-шляхцянкі ў ВКЛ (XVI–XVIII стст.)” [25]. Не апошняе месца ў яе работах займаюць пытанні сексуальнага жыцця, маралі, сямейных здрад, скасавання шлюбу [24, с. 120, 142, 146]. У сваіх працах Н. Сліж зрабіла спробу характарыстыкі шляхецкай сям’і, разгледзела яе тыпалогію, прасачыла эвалюцыю матрыманіяльных паводзін шляхты, паказала ўплыў саслоўнага дзялення грамадства на фарміраванне і развіццё сям’і [26; 27]. У артыкуле “Жаночы вобраз у шляхецкай культуры ВКЛ” Л.Я. Клімуць прасочвае змены жаночага вобраза ў шляхецкім асяроддзі, спыняецца на тых маральных якасцях, якія, на думку грамадства, павінна была мець жанчына. Разам з тым аўтар разглядае і прававое становішча жанчыны ў XVI стагоддзі [13]. Пытанні, звязаныя з прававым, сямейным і грамадскім статусам жанчыны-шляхцянкі, прааналізаваны ў кандыдацкай дысертацыі беларускага гісторыка Н.С. Гардзіенкі “Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім княстве Літоўскім у XVIII стагоддзі”. Тут прасочваецца эвалюцыя сямейных і грамадскіх функцый, якія ўскладаліся на жанчыну на працягу XVIII стагоддзя [8].

Матрыманіяльная праблематыка закранаецца і ў працы А. Мальдзіса “Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі”. У ёй аўтар на падставе аналізу мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя спыняецца на характарыстыцы штодзённага жыцця жыхароў беларускіх земляў, у тым ліку і гараджан [18, с. 217].

Асаблівай увагі заслугоўвае манаграфія І.А. Марзалюка “Магілёў у XII–XVIII стагоддзях: людзі і рэчы”, дзе цэлы параграф прысвечаны матрыманіяльным паводзінам жыхароў Магілёва (“Матрыманіяльныя паводзіны насельніцтва ў XVI–XVIII стст.”). Аўтар у сваёй працы адзначыў існаванне “нявенчанага шлюбу” ў гарадскім асяроддзі, стаўленне грамадства да дадзенай формы шлюбу. На аснове яркіх прыкладаў, прыведзеных у манаграфіі, даследчык зрабіў вывад аб тым, што ў асяроддзі гараджан меў месца развод і былі распаўсюджаны пазашлюбныя стасункі [20, с. 99–103]. Пытанні, звязаныя са скасаваннем шлюбу, разглядаюцца І.А. Марзалюком у артыкуле “Матрыманіяльнасць і секс у Беларусі XI–XVIII стст.” Пры гэтым аўтар спыняецца і на разнастайных формах шлюбу, якія існавалі ў XI–XVIII стст. [21]. Больш падрабязна вывучаюцца матрыманіяльныя паводзіны жыхароў Вялікага княства Літоўскага, у тым ліку і гараджан, у манаграфічнай працы І.А. Марзалюка “Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.)”. У главе “Матрыманіяльнасць і секс” аўтар звяртае ўвагу на эмацыянальную афарбоўку шлюбу, міжасабовыя адносіны ў сям’і. У поле зроку трапілі пытанні, якія датычацца ўзаемаадносін паміж мужам і жонкай, у тым ліку і іх сексуальнае жыццё. Аўтар таксама надае ўвагу і ўзаемаадносінам паміж бацькамі і дзецьмі, іх правамі і абавязкамі. На падставе аналізу кананічнага права аўтар манаграфіі паказвае, якімі, на думку прадстаўнікоў духавенства, павінны былі быць узорныя матрыманіяльныя паводзіны нашых продкаў у X–XVII стст. і наколькі гэты вобраз “ідэальнай сям’і” адпавядаў тагачаснай рэчаіснасці [19].

У 2001 г. пабачыў свет пяты том шматтомнага выдання “Беларусы” “Сям’я”. У ім аналізуюцца розныя аспекты сямейнага жыцця беларусаў, пачынаючы з XVI ст. і заканчваючы XX ст. У поле зроку навукоўцаў трапілі такія пытанні, як тыпалогія сям’і, узаемаадносіны паміж членамі адной сям’і, выхаванне дзяцей [4].

Такім чынам, айчынныя даследчыкі ў апошнія гады зрабілі значны крок у вывучэнні матрыманіяльных адносін нашых продкаў.

**Заключэнне**

Даследаванне гістарыяграфіі матрыманіяльных паводзін гараджан Беларусі ў XVI–XVIII стст. дазваляе зрабіць наступныя высновы:

1. Гістарыяграфія матрыманіяльных паводзін гараджан Беларусі ў XVI–XVIII стст. падзяляецца на некалькі этапаў, кожны з якіх мае свае адметныя рысы;

2. Найбольш вывучанай з'яўляецца гісторыя сялянскай сям'і і сям'і прадстаўнікоў шляхецкага саслоўя;

3. Сямейнае жыццё гараджан Беларусі ў XVI–XVIII стст. слаба вывучана;

4. Адсутнічаюць працы, накіраваныя на рознабаковае вывучэнне дадзенай праблемы;

5. На сённяшні дзень айчынныя даследчыкі звярнулі ўвагу на дадзеную праблематыку і ўжо зроблены першыя крокі па вывучэнню некаторых пытанняў, якія маюць дачыненне да матрыманіяльных паводзін нашых продкаў.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі : са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў [і інш.] ; пад агульн. рэд. М. А. Лазарука. – Мінск : Народная асвета, 1985. – 464 с.
2. Бардах, Ю. Штудыі з гісторыі Вялікага княства Літоўскага / Ю. Бардах. – Мінск : ПОЛИТМАГ, 2002. – 459 с.
3. Бардах, Ю. История государства и права Польши / Ю. Бардах, Б. Леснодорский, М. Пиетрчак. – М. : Юридическая литература, 1980. – 559 с.
4. Беларусы : у 8 т. / рэдкал.: В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1995–2005. – Т. 5 : Сям'я / В. К. Бандарчык [і інш.]. – 2001. – 375 с.
5. Богданович, А.Е. Пережитки древняго міросозерцанія у бѣлорусовъ : Этнографическій очеркъ / А. Е. Богданович. – Гродна : Губ. тип., 1895. – 186 с.
6. Болбас, В. С. Ідэі маральнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння (XVI–XVII ст.) / В. С. Болбас. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі ; Мазыр : Белы вецер, 1998. – 172 с.
7. Вяселле : Абрад / рэд. В. К. Бандарчык, А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.
8. Гардзіенка, Н. С. Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім княстве Літоўскім у XVIII стагоддзі : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 19.02.2003 / Н. С. Гардзіенка ; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2003. – 20 с.
9. Грушевскій, А. Пинское Полѣсье XIV–XVI вв. : історические очерки / А. Грушевскій. – Кіевъ, 1903. – 145 с.
10. Дзербіна, Г. Права і сям'я ў Беларусі эпохі Рэнесансу / Г. Дзербіна. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 175 с.
11. Ефименко, А. Литовско-русские данники и их дани / А. Ефименко // Журнал министерства народного просвещения. – Спб., 1903. – № 1. – С. 106–119.
12. Калачова, І. І. Народныя традыцыі і звычаі выхавання. Этнапедагагічная спадчына народаў Беларусі / І. І. Калачова. – Мінск : НІА, 1999. – 179 с.
13. Калачова, І. І. Этнапедагагічныя традыцыі беларусаў і іх уплыў на сучасную гаспадарчую сям'ю : аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук : 22.06.1995 / І. І. Калачова ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. імя К. Крапівы НАН Беларусі – Мінск, 1995. – 18 с.
14. Клімуць, Л. Я. Жаночы вобраз у шляхецкай культуры ВКЛ / Л. Я. Клімуць // Весн. Магілёў. дзярж. ун-та. – 2003. – № 2–3. – С. 22–35.
15. Козловский, П. Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XVI–XVIII в. (по материалам магнатских вотчин) / П. Г. Козловский. – Минск : Наука и техника, 1969. – 203 с.
16. Копысский, З. Ю. Экономическое развитие городов Беларуси в XVI–

XVII вв. / З. Ю. Копысский – Минск : Наука и техника, 1966. – 226 с.

17. Малиновскій, І. Ученіе о преступленіи по Литовскому Статуту / І. Малиновскій. – Кіевъ : Типографія Имперского ун-та, 1894 – 173 с.

18. Мальдзіс, А. Як жылі нашы продкі ў XVIII стагоддзі / А. Мальдзіс. – Мінск : Лімарыус, 2001. – 384 с.

19. Марзалюк, І. А. Людзі даўняй Беларусі : этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X–XVII стст.) / І. А. Марзалюк. – Магілёў : МДУ, 2003. – 324 с.

20. Марзалюк, І. А. Магілёў у XII–XVIII стагоддзях : людзі і рэчы / І. А. Марзалюк. – Мінск : Веды, 1998. – 260 с.

21. Марзалюк, І. А. Матрыманіяльнасць і секас у Беларусі XI–XVIII стст. / І. А. Марзалюк // Terra alba. – Мінск, 2001. – Т. II : Homo venerius : Сексуальная прастора беларускай культуры / пад рэд. С. І. Даніленкі. – С. 123–129.

22. Никольский, Н. М. Происхождение и история белорусский свадебной обрядности / Н. М. Никольский. – Минск : Изд-во АН БССР, 1956. – 273 с.

23. Ракава, Л. З гісторыі беларускай сям'і / Л. Ракава // Роднае слова. – 1997. – № 6. – С. 172–181.

24. Сліж, Н. Сексуальнае жыццё шляхты Вялікага княства Літоўскага ў XVI–XVIII стст. / Н. Сліж // Terra alba. – Мінск, 2001. – Т. II : Homo venerius : Сексуальная прастора беларускай культуры / пад рэд. С. І. Даніленкі. – С. 141– 158.

25. Сліж, Н. Статус жанчыны-шляхцянкі ў ВКЛ (XVI–XVIII стст.) / Н. Сліж // Беларус. гіст. часоп. – 1996. – № 4. – С. 47–63.

26. Сліж, Н. Тэрміналогія гісторыі шляхецкай сям'і / Н. Сліж, М. Гардзееў // Гістарычны альманах. – 2003. – Т. 9. – С. 49–63.

27. Сліж, Н. І. Шляхецкая сям'я ў Вялікім княстве Літоўскім у XVI–XVII стагоддзях : уздзеянне саслоўнага падзелу грамадства на яе фарміраванне і развіццё : аўтарэф. дыс. .... канд. гіст. навук : 22.03.2002. / Н. І. Сліж ; Ін-т гісторыі НАН Беларусі– Мінск, 2002. – 24 с.

28. Сям'я і сямейны быт беларусаў / пад рэд. В. К. Бандарчыка [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 256 с.

29. Таўталес, А. Права сямейнае паводле літоўскіх Статутаў (нарыс да гісторыі старажытнага беларуска-літоўскага грамадзянскага права) / А. Таўталес // Запіскі аддзелу гуманітарных навук / пад. рэд. З. Даўгяла. – Менск, 1929. – Кн. 8. Т. III : Працы клясы гісторыі. – С. 21–52.

30. Чаквін, І. У. Этнаграфія беларусаў эпохі Скарыны : сямейны і грамадскі побыт, матэрыяльная і духоўная культура / І. У. Чаквін // Скарына і яго эпоха / пад. рэд. В. А. Чамярыцкага. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 280 с.

31. Юхо, І. Крыніцы беларуска-літоўскага права / І. Юхо. – Мінск : Беларусь, 1991. – 238 с.

32. Юхо, И. А. Правовое положение населения Белоруссии в XVI в. / И. А. Юхо. – М. : Изд-во БГУ, 1978. – 144 с.

33. Bardach, J. O dawnej b niedawnej Litwe / J. Bardach. – Posnań : Wydawniectwo Naukowe UAM, 1988. – 443 p.

34. Kuchowicz, Z. Człowiek polskiego baroku / Z. Kuchowicz. – Łódz : Wydawnictwo Łódzkie, 1992. – 395 s.

*Aliakseichykava N.M.* **The matrimonial behaviors of Belarusian townspeople in XVI – XVIII centuries (the historiography aspect)**

This article shows historiography of the matrimonial behaviors townspeople in XVI – XVIII centuries. History of family life is insufficiently known theme in the native of historiography. The fest who was interested by this problem were scientist-ethnographers. Exactly they have made a fest step in analysis of matrimonial behavior of our ancestors. They have several works, which consecrated to history of family life of peasants. There is some information about this problem we can find in investigations of pedagogues and lawyers. They raise separate questions, which have relative to matrimonial behavior of the population of the Belarusian grounds, for example, education of children, legal status of the members of family and others. Native historians appeal to this problems in last time. Today we have proceedings, which devote to family life of peasantry and gentry. A long time the history of townspeople's family remained without attention of the domestic historians. Today Belarusian historians do fist, but very impotent, steps on the road to study by history of townspeople's family.